***Півавар Мікалай Васільевіч,***
кандыдат гістарычных навук, дацэнт, настаўнік гісторыі Віцебскага кадэцкага вучылішча (Віцебск, Беларусь)

# Магчымыя шляхі аптымізацыі публікацыі выданняў, прысвечаных партызанскай барацьбе на Віцебшчыне 1941–1944 гг.

Чым далей ад нас падзеі Другой сусветнай вайны, тым складаней успрымаюцца і асэнсоўваюцца іх рэаліі. Удзельнікі сыходзяць з жыцця, а значнасць падзей закрываюць новыя. Аднак для нашай краіны, якая страціла кожнага трэцяга жыхара, вынікі тых падзей яшчэ доўга будуць адбівацца на будучых пакаленнях. Забываць іх недаравальна, бо занадта дарагую цану заплаціў наш народ за Перамогу.

Апісанне партызанскай барацьбы ў БССР і на Віцебшчыне ў прыватнасці ў гады Вялікай Айчыннай вайны знайшло адлюстраванне на старонках навуковага друку [1,4,7]. Аднак, у асноўным матрыял падаецца абагульнена. У 1960-я – 1980-я гг. дзейнасць асобных партызанскіх злучэнняў знайшла свай адлюстраванне ў мемуарнай літаратуры партызанскіх камандзіраў і ўдзельнікаў ваенных дзеянняў [2,5,8]. Досыць шмат публікацый маецца, напрыклад пра 1-ю Беларускую партызанскую брыгаду, якой камандаваў на Суражчыне М.П.Шмыроў – легендарны “Бацька Мінай”, было апублікавана досыць шмат успамінаў, мемуараў, напісаны кнігі.

Найлепшым прыкладам навуковай публікацыі дакументаў, падрыхтаваных сучаснікамі падзей з’яўляецца выданне Дзяржаўным архівам Віцебскай вобласці кнігі “История 4-й Белорусской партизанской бригады” [3]. Матэрыял быў аформлены ў 1944 г., аднак знаходзіўся на захаванні ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь і выдадзены толькі ў 2010 г. высілкамі віцебскіх і мінскіх архівістаў. На жаль, у архіўным фондзе БШПД маюцца гісторыі васьмі партызанскіх брыгад, якія дзейнічалі на тэрыторыі Віцебскай вобласці. Усяго на тэрыторыі вобласці дзейнічала 39 партызанскіх брыгад, 325 атрадаў, 34 асобных атрады [4. – С. 226].

Аднак, пра дзейнасць шэрагу партызанскіх злучэнняў, якая дзейнічалі на тэрыторыі Віцебшчыны, звесткі эпізадычыя, разрозненыя. Практычна, інфармацыя абмяжоўваецца артыкуламі даведачнага характару ў спецыяльных выданнях і згадкамі ў

некаторых мемуарах і ўспамінах партызанскіх кіраўнікоў. Некаторыя звесткі на старонках мясцовага перыядычнага друку і амаль забытыя цяперашнімі жыхарамі раёна.

На аснове такіх звестак, а таксама сведчанняў вусных крыніц, яшчэ ў саваецкія часы былі падрыхтаваны выданні рознага ўзроўню і якасці. Некаторыя з іх вартыя публікацыі ў форме кніг, часопісаў, газет, на старонках электронных сродкаў масавай інфармацыі

У якасці прыкладу спынімся на кнізе былога настаўніка гісторыі Вярхоўскай СШ Віцебскага раёна Анатоля Аляксандравіча Ганчарова "Первая Витебская партизанская бригада (1941–1943 гг.)". Адзначым, што аўтар ветэранам не быў. Ён нарадзіўся ў 1935 г. Але ягоны бацька быў партызанам 1-й Віцебскай партызанскай брыгады і загінуў у 27.02. 1943 г. Кніга на нашу думку – даніна павагі сына. Своеасаблівая рэфлексія бацькі праз сына. Анатоль зрабіў тое, што мог і павінны быў зрабіць бацька Аляксандр Восіпавіч, калі б застаўся жывы.

Кніга напісана ў 1980-я гг. і заснавана на дакументах і матэрыялах, прадстаўленых камандзірам атрада – М.Ф.Біруліным, падрыхтаваных і аформленых пасля вайны, найбольш верагодна ў першай палове 1960-х гг. Былі выкарыстаны і матэрыялы, атрыманыя аўтарам пры апытаннях удзельнікаў партызанскай барацьбы – байцоў 1-й Віцебскай партызанскай брыгады, інфармацыя з выданняў, у якіх адлюстроўваецца развіццё партызанскай барацьбы на Віцебшчыне. На працягу 2010–2011 г. навучэнцамі Лужаснянскай школы-інтэрната-гімназіі, а цяпер Віцебскага кадэцкага вучылішча, быў зроблены пераклад папяровага варыянта, які меўся ў аўтара, у электронны, адсканаваны ілюстрацыі, праведзена папярэдняя вычытка, рэцэнзаванне.

1-я Віцебская партызанская брыгада ўнесла важкі ўклад у перамогу. Па аўтарскіх дадзеных за час дзейнасці партызанскага атрада, а потым брыгады, партызанамі было знішчана больш 2,5 тысяч салдат і афіцэраў ворага, больш 2 тысяч паранена. У палон захоплены 3 афіцэра і 3 салдата. Падарваны 5 чыгуначных, 40 шашэйных мастоў. Выведзена са строю больш 30 км. чыгуначнага палатна, 24 км. ліній сувязі. У баявых дзеяннях і дыверсіях знішчаны 3 танка, 125 грузавыя і 3 легкавыя аўтамабілі, 22 трактары, 2 матацыклы. Захоплены значныя трафеі. На аснове атрада, потым брыгады ажыццяўлялася сувязь з падпольшчыкамі Віцебска.

Адзначым, што кніга напісана ў часы панавання сацыялістычнай ідэалогіі (якая ўжо мала зразумела сучаснаму пакаленню), а гэта значыць, што яна адлюстроўвае падзеі вайны праз прызму прынцыпу партыйнасці. Кніга з'яўляецца помнікам свайго часу. Жанр, нягледзячы на тое, што аўтар не з'яўляўся ўдзельнікам вайны, можна было б вызначыць як "ветэранская проза", у якой напісаны мемуары большасці былых удзельнікаў вайны. Як і ўсе мемуары, успаміны, матэрыялы, выкарыстаныя аўтарам, маюць суб'ектыўны характар. Напрыклад, з мэтай найлепш прадставіць вынікі дзейнасці атрада, сустракаюцца перабольшанні. Так на С. 27 чытаем: "в течение августа-октября [1941] партизаны между Витебском-Суражем и Лужесном, Лужесном и Мазоловым, Витебском и Городком … сожгли около 20 мостов.". На С. 32 прыводзіцца больш сціплая справаздача: "С августа 1941 года по январь 1942 года … взорвано 17 мостов".

Ёсць і іншыя перабольшванні. "22 февраля 1942 года вместе с подразделениями 249-ой стрелковой дивизии партизаны группы М.Ф.Бирюлина разгромили немецкий гарнизон в поселке Лужесно и Мазолово…". Боевыми действиями в поселке Лужесно руководил командир отряда М.Ф.Бирюлин. Потеряв более сотни солдат и офицеров, побросав все имущество и транспорт (в том числе около 150 лошадей), противник бежал в сторону Витебска". Гэта ўсё з улікам таго, што партызанскі атрад налічваў толькі 20 чалавек! [С.32]. Да і боем наўрад ці кіраваў М.Ф. Бірулін, з улікам таго, што партызаны дзейнічалі разам з кадравымі салдатамі 925 стралковага палка 16 гвардзейскай стралковай дывізіі 4-й Ударнай Арміі. Да тога, атрад быў падзелены на дзве роўныя часткі – 10 чалавек паказвалі дарогу на в. Лужасна, а 10 на в. Мазалава.

Аб'ектыўнае напісанне кнігі пра гісторыю Віцебскай партызанскай брыгады наперадзе. Яно павінна грунтавацца на дакументах часоў вайны, якія захоўваюцца ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь [Фонд 1450 (БШПР).], пажадана было б выкарыстаць і дакументы нямецкіх архіваў, якія пры перакрыжаваным падыходзе маглі б садзейнічаць напісанню аб'ектыўнай гісторыі партызанскага руху, адказу на важныя пытанні часоў акупацыі – супрацоўніцтве часткі беларускага народа з гітлераўцамі, кошце перамогі, укладзе партызанаў і падпольшчыкаў у Перамогу над фашызмам. Істотную ролю маглі б аказаць успаміны

мясцовых жыхароў, інтэраью удзельнікаў, але гэта ўжо на жаль немагчыма.

На маю думку, кніга прысвечана не толькі барацьбе. Матэрыял у ёй падаецца шырэй. Дзякуючы эмацыянальнасці аўтарскай падачы матэрыялу, яна дазваляе адчуць атмасферу таго цяпер ужо далёкага часу. Кніга трансліруе напамін для пакалення, якое не зведала жахаў вайны, што можа быць вынікам вайны.

Адным з найбольш каштоўных дасягненняў кнігі з’яўляецца тое, што тут змяшчаюцца сотні імёнаў удзельнікаў падзей сямідзесяцігадовай даўніны: партызан, падпольшчыкаў, мірных грамадзян, асоб, якія супрацоўнічалі з акупантамі. Гісторыя – перш за ўсё, гэта людзі.

Вызначым некаторыя праблемы, якія паўстаюць перад рэдактарамі поствaенных мемуараў і выданняў, прысвечаных Вялікай Айчыннай вайне. Па-першае, стыль выкладання, па-другое, ідэалагічная заангажаванасць, па-трэцяе, фактaлагічныя перабольшанні, жаданне выставіць свае дзеянні ў лепшым свеце.

Улічваючы, што вельмі цяжка правесці стылістычную праўку матэрыяла, напісанага некалькі дзесяткаў гадоў таму, варта пакінуць тэкст мінімальна рэдагаваным, як помнік часу. Але з мэтай паляпшэння узроўня выдання неабходна, на нашу думку зрабіць наступныя дзеянні. У выданне абавязкова павінны быць уключаны навуковы каментар тэксту, у якім будзе максімальна аб’ектыўна, на навуковай, а не эмацыйнай аснове разгледжаны матэрыял, які падаецца ў кнізе. Правесці якасную вычытку тэкста не толькі на прадмет арфаграфічных памылак, але і дакладнасці прозвішчаў і геаграфічных паняццяў, якія сустракаюцца ў выданні. Абавязкова зрабіць геаграфічны і персанальны паказальнікі. Напрыканцы выдання зрабіць кароткія вывады. Па магчымасці, правесці працу ў архіве з аўтэнтычнымі дакументамі, якія б маглі пацвердзіць (ці абвергнуць) інфармацыю вусных крыніц.

Падрыхтаваная кніга, нягледзячы на пэўную суб’ектыўнасць падачы матэрыялу, з’яўляецца каштоўнай крыніцай па гісторыі пэўнага краю. Тыя звесткі, якія падаюцца ў ёй, той каштоўны фактaлагічны матэрыял, які не знайшоў адлюстраванне ў акадэмічных выданнях, прыклады самаадданай любові да Радзімы аднаўляе памяць пра сотні асоб і робіць найважнейшую справу ў фарміраванні грамадзянскіх якасцяў, выхаванні патрыятызму, любові да роднага краю.

Матэрыялы такіх выданняў могуць дапамагаць ва ўдакладненні спісу загінуўшых мірных жыхароў у гады вайны і мемарыялізацыі памяці пра іх. У Віцебскім раёне такіх толькі 4 (в. Гарькава, Гарадняны, Котава, Малыжына). Даследаваннямі віцебскіх кадэт у 2018–2019 гг. выўлены яшчэ 19. Пахаванні ахвяр вайны ў Беларусі вельмі неахвотна бяруцца на ўлік дзяржаўнымі органамі. Чыноўнікі спасылаюцца на адсутнасць дакументаў, якія пацвярджаюць факт гібелі людзей. Звесткі, якія прыводзяцца ў выданнях могуць стаць аснаваннем для мемарыялізацыі.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны. Мн.: Беларусь, 1967–1983. Т. 1-3.
2. Захаров И. Война в краю озер. Мн.: Беларусь, 1973. 318 с.
3. История 4-й Белорусской партизанской бригады / сост. Н.В.Воронова. Мн: НАРБ, 2010. 162 с.
4. Коваленя А.А. и др. Великая Отечественная война советского народа (в контексте Второй мировой войны) / Под ред. А.А.Ковалени, Н.С.Сташкевича, пер. с бел. яз. А.В.Скорохода. Мн.: Изд. центр БГУ, 2004. 231 с.
5. Лобанок В.Е. Партизаны принимают бой. М.: Государственное издательство политической пропаганды, 1972. 306 с.
6. Партызанскі рух і падполле Віцебскай вобласці ў гады Вялікай Айчыннай вайны (1941–1945 гг.): Бібліяграфічны паказальнік / склад.: Л.Т.Бяззубік, Н.С.Кітовіч. Віцебск: ВАБ, 1975. 67 с.
7. Партизанские формирования Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 – июль 1944): Краткие сведения об орг. структуре партиз. соединений, бригад (полков), отрядов (батальонов) и их личном составе. Мн.: Беларусь, 1983. 765 с.
8. Титков И.Ф. Бригада «Железняк». Мн.: Беларусь, 1982. 268 с.


* * *